# СТАЎЛЕННЕ ДА ЧАЛАВЕЧЫХ ЗАГАНАЎ У НАРОДНЫХ ГУМАРЫСТЫЧНЫХ ТВОРАХ БЕЛАРУСАЎ XX – XXI стст.

**А. А. Жвалеўская**

Адной з дамінуючых тэм гумарыстычных твораў ва ўсе часы былі чалавечыя заганы. «Смех – гэта тэст на чалавечую вартасць»[6, с. 4] – так тлумачыць наяўнасць вялікай колькасці жартаў на гэты конт А. Бельскі. Па тым, якія адмоўныя якасці высмейвалі людзі ў пэўным часава-прасторавым асяроддзі, можна даведацца пра іх узаемаадносіны паміж сабой, пра тое, якія якасці яны заахвочвалі і якія асуджалі. Найбольш дакладна, на маю думку, абагулены гэтыя адмоўныя якасці ў прадмове да зборніка «Беларускія народныя жарты»: «Чалавек смяецца над усім тым ва ўласнай прыродзе, што стрымлівае яго пераможную хаду наперад – далей ад звярынага і жывёльнага, над усім тым, што перашкаджае яму спазнаць і адчуць на ўсю сілу, якое гэта шчасце – быць Чалавекам…» [1, с. 4]. Адлюстраванне менталітэту беларусаў у XX – пачатку XXI стст. патрабуе звестак з гэтай сферы духоўнага жыцця. І менавіта жартоўныя творы здольны даць такія звесткі.

Сярод якасцяў, якія высмейвалі беларусы, бадай ці не першай варта назваць гультайства. Персанажаў-гультаёў было вялікае мноства: і мужы, і жонкі, і дзеці, і студэнты, і проста абагуленыя вобразы віхляяў і абібокаў. Усе яны з’яўляюцца аб’ектам смеху, які вельмі часта вынікае з іх няздольнасці нічога зрабіць, іх марнага імкнення схаваць сваё гультайства з дапамогай апраўданняў, іх спробаў зрабіць якую-небудзь працу, прыкладаючы мінімум намаганняў. Адметна, што ў адным з анекдотаў, што высмейваюць гультаёў, паказваецца, што нават мухі

могуць быць больш карысныя за гультая. Гультайства, такім чынам, з’яўляецца аб’ектам не толькі здзеку, але і пагарды.

Беларусы нярэдка смяюцца з няведання і няўмельства. Часам у гумарыстычных творах гэта праяўляецца не толькі ў дачыненні да вынаходніцтваў, а часам – у сувязі з выкарыстаннем самых звычайных рэчаў. Як і ў выпадку з гультаямі, невукі імкнуцца стаіць свой заган і тым самым яшчэ больш яго праяўляюць. Прыкладам можа служыць анекдот «Дзеці вінаватыя» у якім непісьменная жанчына, «чытаючы» кніжку, трымае яе дагары нагамі і тлумачыць гэта наступным чынам: «Гэта ж дома дзеці, каб іх чэрці пабралі, перавярнулі, а я і забыла» [3, с. 266]. Няведанне можа стаць вынікам таксама і несістэмізаваных, адрывістых ведаў. Да прыкладу, жонка перасольвае свайму мужу суп, бо прачытала, што чалавек павінен з’есці больш за тры кілаграмы солі за год. Іншым разам прычынай няведання можа стаць банальная няўважлівасць, што таксама выглядае камічна: напрыклад, мужчына запытваецца ў сваёй жонкі, ці ёсць ванна ў іх кватэры, дзе яны пражылі ўжо два гады (анекдот «Не разгледзеў»). Трэба зазначыць, што ахвярай такіх анекдотаў таксама маглі быць абсалютна любыя людзі, незалежна ад іх пола, узроста і прафесіі. Увогуле ж гэтую адмоўную рысу добра рэзюмуе прыказка: «Чалавек невучоны, як тапор не тачоны» [2, с. 257], якая падкрэслівае паважнае стаўленне беларусаў да ведаў і адукацыі.

Звязанай з гэтымі заганамі з’яўляецца і такая адмоўная якасць, як адсутнасць талентаў. Высмейваецца, як правіла, не сам факт адсутнасці якіх-небудзь здольнасцяў, а тое, што людзі імкнуцца прадэманстраваць іх наяўнасць. У такіх выпадках ім не кажуць прамым тэкстам, што яны не маюць таленту, а паказваюць гэта іранічнымі каментарыямі. Гэты падыход, на маю думку, значна больш ветлівы і эфектыўны для таго, каб чалавек зразумеў, што не трэба выстаўляць на паказ тое, чаго ў яго няма.

Як ужо зразумела з вышэйпрыведзенага, не заахвочваецца ў беларусаў і фанабэрыстасць. Часам гэтая якасць можа проста высмейвацца, як у выпадку з бабкай, якая набыла боты, каб людзі не думалі, што яна бяднячка, але насіла старая іх у руках, бо не любіла абувацца. У іншых жа гумарыстычных творах паказваецца, як фанабэрыстасць шкодзіць яе ўладальніку, як у анекдоце «Натыркнуўся, як Трахім на загародку». У любым выпадку ідавочна перавага сціплага чалавека над ганарлівым.

Яшчэ адной якасцю, якая не выклікала і не выклікае павагу ў беларусаў, з’яўляецца сквапнасць. Хцівыя людзі ў гумарыстычных творах нярэдка трапляюць у пасткі, якія расставіла ім іх натура: боты ў іх крывяцца, бо не аплачаны, аднавяскоўцы даюць ім мянушкі і г.д. Але нават без такіх непрыемных сітуацый сквапныя людзі могуць стаць

аб’ектам для смеху праз тое, якім дакладна чынам яны праяўляюць гэтую сваю рысу характара: пераходзяць на іншы бок вуліцы, узяўшы пазыку, імкнуцца дасніць сон, дзе ім прапаноўвалі грошы і г.д. Часам справа даходзіць да абсурду: аўцюковец просіць сыпаць у гарбату 8 лыжак цукру, але не мяшаць іх, бо ён не любіць салодкае. Гэтым стваральнікі і расказчыкі гумарыстычных твораў паказваюць, што не абавязкова мець непрыемнасці для таго, каб рабіцца мішэнню для жартаў.

Беларусы спрадвеку славіліся сваёй гасціннасцю. У доказ таго, як высока ацэньвалася і ацэньваецца гэтая якасць у жыхароў нашай краіны, можна прывесці шэраг жартоўных твораў. У адных з іх адсутнасць гасціннасці ў гаспадароў ненаўмысная, у іншых жа людзі свядома імкнуцца як мага менш пакінуць гасцям. Здзекі з такіх гаспадароў нярэдка прымаюць форму чутак, і перадаюцца з вуснаў у вусны. Такім чынам, ствараецца своеасаблівы псіхалагічны прэс, які прымушае людзей сустракаць гасцей згодна ўсталяваным у грамадстве нормам, каб не стаць ізгоем і аб’ектам трапных жартаў.

Цікавым таксама з’яўляецца стаўленне беларусаў да гаманлівасці і няшчырасці. Вядома, сярод тых, хто апавядае анекдоты, звычайна сустракаюцца людзі гаваркія. Але існуюць і тыя, хто звязвае доўгія размовы з падманам: «Не ўмею хлусіць, дак не ўмею доўга гаварыць» [5, с. 36], кажа адна з аўцюкоўскіх жанчын. Такое стаўленне, адлюстраванае ў гумарыстычнай форме, сведчыць пра тое, што людзі хоць і падазравалі балбатуноў у няшчырасці, але ставіліся да гэтага досыць паблажліва, смяяліся, а не кпілі з гэтай асаблівасці характару. Увогуле, стаўленне да падману было не заўсёды адмоўным. У некаторых творах камічны эфект дасягаўся менавіта выкрыццём падману, і здзек быў накіраваны на няшчырага чалавека: напрыклад, калі мужчына просіць самай таннай калбасы і апраўдваецца, што гэта для ягонага сабакі, гандлярка запытвае, ці парэзаць яму, ці ён так з’ясі. Але ў іншым выпадку, калі хлусня была смешай ці проста цікавай яе аўтару даравалась (а часам і заахвочвалася) няшчырасць. І наадварот, нецікавасць нават самай праўдзівай інфармацыі можа ствараць падставу для іроніі: у адным з жартаў аўцюковец запытвае абласнога лектара, ці не бачыў той, хто ўзяў шапку аўцюкоўца. Сваё пытанне ён абгрунтоўвае наступным чынам: «…у зале ўсе спалі, акрамя цябе. Мо бачыў, хто браў?» [4, с. 57].

Стаўленне да падману вельмі лаканічна і трапна выражана словамі аднаго аўцюкоўскага хвалько: «Не падабаецца – не слухай, а брахаць не мяшай» [4, с. 27]. Пра тое, што падман можа мець і станоўчыя вынікі, сведчыць таксама і парада ніколі не казаць праўды, што сустракаецца ў адным з аўцюкоўскіх анекдотаў. Чалавек, што дае такую параду, матывуе гэта тым, што калі казаць праўду, можна пазбавіцца ўсіх

сяброў. Гэткія рэалістычныя адносіны да падману вельмі ўласцівы для жартоўных твораў, у процівагу іншым жанрам фальклору, якія больш акцэнт робяць на маралізуючай функцыі.

Значна радзей, чым з папярэдніх заганаў, але ўсё ж сустракаюцца ў жартоўных творах здзекі з нявтлівасці. Напрыклад, араты не частуе хлебам падарожніка, які з ім не павітаўся; у іншым анекдоце афіцыянтка адказвае «у тон» хамаватаму аўцюкоўцу: «Чай будзеце ці “ну яго…”?»[4, с. 19]. Нячаста смяюцца ў беларускім фальклоры і з помслівасці. Невялікая распаўсюджанасць здзекаў з гэтых рыс характару можна вытлумачыць двума абставінамі: па-першае, гэтыя якасці не лічыліся настолькі сур’ёзнымі і адмоўнымі, як сквапнасць, гультайства, і іншыя вышэйпрыведзеныя заганы. Па-другое, яны не настолькі распаўсюджаны сярод беларусаў, таму ім не надаецца значная ўвага. Цяжка сказаць, якая з гэтых прычын больш адпавяжае рэчаіснасці. Мяркую, абедзьве яны ў той ці іншай ступені адказныя за адсутнасць распаўсюджанасці гумарыстычных твораў пра нявтлівасць і помслівасць.

Адметным з’яўляецца стаўленне беларусаў да п’янства, адлюстраванае ў гумарыстычных творах. Па сутнасці, п’яныя, што фігуруюць у анекдотах, амаль не высмейваюцца, не асуджаюцца: у вялікай колькасці анекдотаў яны прадстаўлены як дасціпныя, вясёлыя людзі. П’янства нярэдка лічыцца нормай у грамадстве. Часам яму не перашкаджалі нават савецкія актывісты. Напрыклад, культасветработнік з Турава, выпіўшы акцёрскай сапраўднай гарэлкі, на словах падцвердзіў, што яна бутафорская. Гарэлкай прапаноўваецца напойваць пеўня, каб ён лепш таптаў кур. Праўда, час ад часу схільныя да нецвярозага ладу жыцця людзі ўсё ж высмейваюцца, але не злосна і не надта часта. Трэба адзначыць, дарэчы, што такое стаўленне не з’явілася толькі ў савецкую эпоху, а перайшло ў спадчыну з папярэдніх часоў. Пішучы пра дарэвалюцыйны гумар, А.С. Фядосік адзначаў: «Па-рознаму ставіліся працоўныя да п’янства. Некаторыя не разумелі ўсёй шкоды гарэлкі. Таму ў песнях часам гучыць лёгкі гумар» [7, с. 81].

Таксама часам перавагі бачацца жартаўнікам і ў іншай шкоднай звычцы: паленні. Тураўскае жартоўнае апавяданне «Заядлы курэц» сведчыць пра шматлікія станоўчыя бакі жыцця таго, хто паліць: да яго і злодзеі не залезуць, і сабакі не пакусаюць, і г.д. Да таго ж, курэц Міхаіл паказваецца ў апавяданні дасціпным і знаходлівым чалавекам.

Такім чынам, можна ўбачыць, што гумарыстычныя творы дазваляюць нам вызначыць самыя адмоўныя, з пункту гледжання беларусаў XX – пачатку XXI стагоддзя, якасці. Жарты з гультайства, невуцтва і іншых недахопаў дазваляюць зрабіць выснову, што менавіта гэтых рысаў жадалі і жадаюць пазбавіцца беларусы ў разгледжаны перыяд.

**Літаратура**


1. Беларускія народныя жарты/ сабраў і склаў З. Бяспалы. Мінск, 1970.
2. Вожык у дарозе / Уступ. арт. У. Корбана, Г. Кляўко. Мінск, 1966.
3. Жарты, анекдоты, гумарэскі // Беларуская народная творчасць. 2-ое выд., дапр. Мінск, 2005.
4. *Ліпск, У. С.* Аўцюкоўскія шуры-муры. Мінск, 2008.
5. *Ліпскі У. С.* Аўцюкоўцы. Мінск, 1995.
6. Смяяцца не грэх / Уклад. А. Бельскі. Мінск, 2002.
7. *Фядосік А. С.* Трапным народным словам. Мінск, 1971.